**Лера Сом**

# Свабода Слова
# Зіма

***вершы***

KAMUNIKAT.org

**Менск**
**Логвінаў**
**2005**

**Менск, Логвінаў, 2005. — 130 с.**

KAMUNIKAT.org

# I. Усе мы філёзафы…

KAMUNIKAT.ORG

* * *

Усе мы філёзафы,
пакуль не забаліць галава.
Гібеем над глёсамі,
навокал падрастае трава.
Нататнікі стосамі,
ды вось не прылятае сава...
Усе мы філёзафы –
пакуль не забаліць галава.

Усе мы каханыя,
пакуль не прагучала "пакуль"...
Жыцьцё – штука танная,
пакалькі не шкадуецца куль.
Шуруюць старанныя,
адзінкі выштурхоўвае нуль...
Усе мы каханыя...
пакуль не прагучала "пакуль".

Усе мы шчасьлівыя
калі-небудзь ды будзем, але!
Калі клапатлівыя
дзядкі пераляжаць на стале.
Худыя, юрлівыя,
Таўстыя, цнатлівыя,
Прыгожыя, цьвілыя,
Дурныя, гняўлівыя –
Усе мы шчасьлівыя
Калі-небудзь ды будзем... Але?..

* * *

Калі я зьнікну (гэта будзе хутка),
Ні сьледу не пакінуўшы, ні гуку,
Калі я зьнікну – першая з кагорты
Расчараваных і расчараваўшых,
Калі я зьнікну раптам, быццам зьнічка, --
Так, вось яна была і вось згарэла, --
Ня здолееш ты нават узгадаць
Маё, такое простае, імя...
Калі я зьнікну? Гэта будзе хутка.

KAMUNIKAT.org

* * *

Дажыла да зялёнай травы
І да кветак каштана…
Аддала ўсе пазыкі сьнягам
І халоднаму ветру...
Прачытаўшы шматтомнік зімы,
Падыходжу да сонца,
А што будзе далей – не хачу
Варажыць і прадказваць.

А нястомныя дурні чакаюць
Цудоўных прароцтваў…
Ім мой смутак па тым, каб ня ведаць,
Здаецца пагардай.
Іх зіма – гэта толькі каштоўнае
Цёплае футра,
Лета ім – чаргаваньне адбіткаў
На шкле акуляраў.

Колькі раз я зьбіралася змоўкнуць,
Зрабіцца нябытам…
Ссохнуць дрэвам,
Замёрзнуць ракою,
Апасьці лістотай...
І ня крыўдзіць,
Ня шкодзіць нікому
Учэпістым словам,
У лякарні
Узяўшы даведку,
Што я звар'яцела…

Але людзі ідуць,
Я вяшчую,
І гэтак бясконца...

* * *

Месяц верасень, месяц верасень,
Спрэс атручаны рэчаіснасьцю...
Дзе той мары сьвет, дзе той веры сэнс, --
Не прынізяць нас гэткай літасьцю.

Не гучаць званы, не пяюць званы,
Цішыня шапоча зьнясілена...
Праўды не сказаць, не пачуць маны –
Распаўзьліся па чорных шчылінах.

Залацістым яблыкам поўня зноў
Ноччу ў раніцу пакацілася...
Не сасьніць мне болей прароцкіх сноў,
Бо мінулае ў іх адбілася...

Хто прачнецца, хто ў горадзе маім
Выйдзе, да сьвятла пойдзе пакрысе?..
Цягнецца мой боль, я іду за ім,
Крочыць па начы месяц верасень.

KAMUNIKAT.org

* * *

У тым варыянце, калі
Я так хутка вярнуся,
Ніхто не пасьпее заняць
Майго месца пад сонцам.
А, значыцца, я не парушу
Спакой навакольны –
Стаміўся ад войнаў сусьвет
І любові жадае.

У тым варыянце, калі
Я вярнуся запозна,
Я буду настолькі разумнай,
Каб ведаць прычыны.
Усе таямніцы мінулага
Вылічу ўпарта,
Згуляю дакладна
І месца сваё атрымаю.

У тым варыянце, калі
Я зусім не вярнуся,
Мне будзе пляваць на
Усе памянёныя месцы.
Я буду далёка-далёка,
І іншая зорка
Мне стане падказваць шляхі
Да наступнае мары.

*  *  *

Ці ня з гэтых начэй –
адзінокіх, бяссонных, працяглых,
Вырастае і ўпартасьць
ісьці да апошняй мяжы,
Дзе твой прывідны сьвет,
быццам кропля на вуснах засьмяглых,
Раптам робіцца явай,
у якой табе прыйдзецца жыць.

Вось яно, гэта княства!
Тут досыць цудоўных напояў,
І прыгожых жанчын,
і вясёлых адданых сяброў...
Залацістыя вежы...
Усё, што здавалася мрояй,
Без падману і жартаў
прытулак для вольных вятроў.

Дык чаму надвячоркам
так кліча старая дарога,
І са смуткам і жалем
узіраешся пільна туды,
Дзе ты просты сьпявак...
Ад цябе не залежыць нічога.
Ці амаль што нічога...
І дзе быў асуджаны ты?..

## Здані – II, дарожныя

Па дарозе зь Вільні на Полацак
Уцякаем ад навальніцы…
Нам маланкі б’юць наўздагонку,
Нам грамы разьдзіраюць вушы…
Па дарозе зь Вільні на Полацак,
Са сталіцы і да сталіцы
Мкнуцца нашыя абалонкі,
Ненадзейны прытулак душаў.

Па дарозе зь Вільні на Полацак
Шаты дрэваў, крыжы і дахі,
Часткі вечнага краявіду,
Непаўторныя і ў падобным…
Па дарозе зь Вільні на Полацак
Адыходзяць начныя жахі,
Тыя, што працінаюць дзідай
Розум хіжы і самаробны.

Па дарозе зь Вільні на Полацак
Назаўсёды імчацца дадзена.
Можа, нехта за нас памоліцца,
Да дзівацкіх учынкаў схільны…
І дарога зь Вільні на Полацак –
Вось адзінае, што не скрадзена...
Нам ня трапіць ніколі ў Полацак,
Нам ніколі ня ўбачыць Вільні.

kamunikat.org

* * *

Марозік і крышку сонца...
Натоўпы ў задушных крамах…
Ідзе мітусьня і гандаль
Усім, што табе ня трэба.
Знаёміцца лепей ноччу
І з горадам, і са мной.

Тады маладзік ці поўня
Цябе павядуць шляхамі
Кручастых сівых завулкаў,
Дзе лішніх людзей ня будзе,
А толькі прастора часу,
І час зразумець прастору,
І ўсе вымярэньні месца,
Дзе можна знайсьці сябе.

...Тут вецер упарта носіць
І ноччу, і днём, і ранкам,
Па вулках, плошчах і дахах,
Па хісткіх пустых хацінах
Мянушку-імя маё.

KAMUNIKAT.org

* * *

І гэты горад, празь які
Мяне завуць правінцыялкай,
Люблю да дрыжыкаў. І ён
(Здаецца мне) мяне калісьці
Ды не, не палюбіў – запомніў…

І ведаю, што да яго
Зь любых шляхоў,
З усіх каханьняў
Вярнуся… (Толькі дзеля ўздыху:
-- А, гэта тая, што сьпявала…)

KAMUNIKAT.org

*   *   *

Відаць, сапраўды сябраваць
Можна толькі з памерлым…
І кожная кніга – як ліст
Да мяне, для мяне...
І кожны радок мой
Шукае сабе адрасата –
Пішу незнаёмым каханым,
Далёкім сябрам.

Відаць, сапраўды разумець
Можна толькі далёкіх...
Мы з гэтаю зоркаю
Любім дуэтам сьпяваць
Жахлівыя песьні,
Салодкія цёплыя казкі...
Блукаць уначы –
Асалода, вядомая мне.

Мой стомлены горад
Нясе на рамёнах стагодзьдзі.
Яго маладым я шаную,
Нямоглым – кахаю…
Даруй, залацістае раньне,
Мятлушцы начной…

* * *

Што маймy добраму Богу
Трэба яшчэ ад мяне?
Ён мне прызначыў дарогу
З тых, што любога сагне.

Што тут скуголіць... Нічога,
Годнасьць ня дасца дарма.
Толькі -- у добрага Бога
Ў позірку ласкі няма.

Гэта старая зьнямога
Мала каму навіна:
Й лепшага добрага Бога
Люціць прамая сьпіна.

KAMUNIKAT.org

* * *

Мара здохла, падняла ножкі
І адкінула капыты.
За вакном пацямнела трошкі,
Пачалі марцаваць каты…

Як найлепшы таксідэрміста
Упарадкую мару я:
На падставачцы залацістай
Мара вымытая мая.

Так, праходзьце, сядайце, госьці,
Прыгадайце: "Усё міне..."
Заўтра вечарам прыйдзе хтосьці
Не па мару, а па мяне.

KAMUNIKAT.org

* * *

Што мне ў табе асэнсоўваць, дурное стагодзьдзе?
Быццам бы змена стагодзьдзя зьмяняе людзей...
Штосьці будуюць на дурасьці, штось на выгодзе,
Побач адна толькі сьмерць неадступна ідзе.

Нам не даруюць ні лепшых, ні горшых учынкаў,
Нас за мінулае сёньня настойліва б'юць.
Браце паэт... Там, за кратамі, ёсьць аблачынка.
Браце мой кат... І сьмяротнікі песьні пяюць.

Спынім гадзіньнік, ды час, што ідзе і праходзіць,
Нам не спыніць – ні ў вайне, ні ў сяўбе, ні ў дзяльбе.
Што мне ў табе асэнсоўваць, дурное стагодзьдзе?
Ўсе мы – ахвяры і судзьдзі, твае і табе.

*31.12.2000.*

*   *   *

Спачатку прыдумаць сабе каляндар,
Пасьля сьвяткаваць каляндарныя даты…
Дзе звычка, дзе прага няскрадзеных мар, --
Народзіны года сьвяткуем заўзята.

Іх столькі мінула ў бядзе і нудзе,
Што глупства – чакаць адкрыцьця ці палёгкі.
Ды ўсё ж спадзяешся – год новы прыйдзе,
І зорка успыхне надзеяю дрогкай.

KAMUNIKAT.org

* * *

Кожны мае свой страх,
Як атрутную кветку,
Колькі ўласную волю
Ты не дакарай.
Я баюся прачнуцца
Рускамоўнай паэткай,
*Опевающей*
*Северо-Западный край.*

KAMUNIKAT.org

* * *

Чакаць крыгаходу,
Спазьняцца, пачатку
Ня ўбачыць ні разу.

Гадзінамі моўчкі
Сачыць
Перасоўваньне крыгаў.

На мокрых дубцах
Выразаць залатыя імёны,
Якімі ніколі, ніколі
Цябе не ўзгадаюць.

Шпурляць іх да крыгаў –
А раптам, а раптам
Твой тайнапіс рунны
Дамкнецца да мора,
І мора яго прасьпявае...

Пайсьці зь непакоем,
І зноўку
Упарта, зацята
Чакаць як мяжы і пачатку,
Чакаць крыгаходу.

KAMUNIKAT.org

* * *

У настаўніках – сьмерць,
Сьмерць пачуцьцяў і ісьцін,
Ды калі-некалі –
Прадчувальныя сны…
Так жывеш, каб ня мець
Шматпакутнага лісьця
З тых размоў, што вялі
У шынку да вясны.

У сябрах – мудрацы,
Запісныя дарадцы,
Супрацоўнік сьвятла
Ты для гэтых вачэй…
Прыхаваны канцы –
Немагчыма намацаць,
Што за доля цяпла
Імі зьесца яшчэ.

У каханых – яна,
Адзінота вялікіх,
Невыносная тым,
Хто шукае прасьцей.
Недалёка да дна
Пры асобных падліках…
Гэта зьніч, гэта дым,
Гэта сьвет, карацей.

З дня на дзень, з году ў год
Ты жывеш так, і побач
Адзінота і сьмерць,
Мудрацы і статут
На любы крыгаход,
На любоўную слодыч…
Абавязак гарэць
Толькі так, толькі тут.

Ды імкненьня няма
Зьбегчы з гэтага сьвету
(І за тое мерсі,
Што народжаны мы)…
І заўсёды зіма
Для асобных паэтаў,
І свабода ва ўсім,
Што ня тычыць зімы.

KAMUNIKAT.org

* * *

Я смалю перасохлы тытунь
І шукаю забытыя словы...
У вясновую гэту слату
Сьвет халодны, пусты і ня новы.

Мне яго не пакінуць пакуль,
І ня выправіць большасьці хібаў
Ні ў кім з тых, каму цісну руку,
Ні ў сабе, што глядзіць на раку
І варожыць па цёмным пяску
У чаканьні загадкавых рыбаў.

KAMUNIKAT.org

* * *

Нашы прыстойныя п’янкі,
Як вобраз жыцьця
(Вельмі багемны
І вельмі падобны на сьмерць)
Нам уядаюцца ў кроў,
Толькі ведаеш, сьпірт,
Мае тэндэнцыі
Вобраз захоўваць, ды вось –
Ты... Цябе няма з намі
Тут.

Нашы прыстойныя вершы,
Як спроба сябе
Ціха правесьці да вечнасьці
Праз чорны ход
Цяжка атручваюць душы
Цнатлівых істот,
Вечных ахвяр,
Каляровых адбіткаў, і зноў –
Ты... Цябе няма з намі
Тут.

Нашы каханкі
І нашы каханьні ў адным
Целе ніколі ня будуць,
Падвойнасьць – як лёс
Дзікага розуму,
Таннага сэрца, і ў нас
Ёсьць падазрэньне, што й тут
Вінаватая ты –
Ты, якой няма з намі
Тут.

...Нашае права
Забіць адзіночку заўжды
Нам перавагу давала
І будзе даваць.
Гэй, паляваньне пачатае,
Рог прасьпяваў...
З болем у голасе
Скажам аднойчы пасьля:
Ты! Цябе няма з намі
Тут.

*   *   *

Пакіньце багоў у спакоі –
Ім хочацца ціха сканаць,
Сваё існаванне другое
Ізноў на жыцьцё памяняць.

Праклёнаў і пацераў сьмецьце
Эпохі, стагодзьдзі, гады...
Мы, несамастойныя дзеці,
Баімся зайсьці не туды.

Чакаем, каб нехта за ручку
Ў сьвятло залатое адвёў,
Падцёр даравальнай анучкай
І сьлёзкі, і сьлінькі, і кроў...

Дзіцячага сну асалода...
Ды некалі грымне для нас
Сьвітанак нялёгкі – свабода,
Адзіна магчымы адказ.

KAMUNIKAT.org

*   *   *

Сьнег сьвеціцца. Цемра.
Сьнег сочыць за сэнсам
Сну ў шэрым суладзьдзі…
Ноч доўгага сьнежня,
Дзень кволага сонца…
Сэнс роспачы – шэптам.

KAMUNIKAT.org

* * *

Не было пятлі і пылу:
Прыбрала я, як на сьвята,
Каляровую кватэру,
І сяджу, чакаю госьцю…
Нехта кажа: “Сьмерць – мужчына”,
Толькі я, па завядзёнцы,
На жанчыну спадзяюся,
І таму падрыхтавала
Да ***яе*** прыходу сцэну,
На якой мы разыграем
П’есу ў стылі дзядзькі Сартра…

...Рызыкоўная надзея
Застанецца на вячэру,
Раніцой жа ёсьць гадзіна
На стварэньне маналогаў…
Тры лісты і тры канвэрты
(Лінаваная папера),
Тым усім, што не кахалі,
Не кахаюць і ня будуць…

Кіньце! Тут не самагубства
З-за няшчаснага каханьня!
Проста, зьведаўшы дарогу,
Трэба зьведаць і канчатак.
І паколькі маю права
Прызначаць сама спатканьне,
Я яго на гэты вечар
І прызначыла. А, зрэшты,
Адмаўляцца не прыстала
Тым, каго я запрашаю…

Прыйдзе сьмерць.
Мы пагаворым,
І дамовімся, магчыма,
Там, дзе ні пятлі, ні пылу,
Тут, дзе вельмі любяць каву.

*   *   *

Суразмоўцы далёка. Папера
Не падкажа, бо мае сама
Не давер, а адбіткі даверу,
А адбіткам
Даверу няма.

Суразмоўцы няма.
Ёсьць маўклівасьць
Надвячорка над соннай ракой,
Ўтаймаваных пачуцьцяў прыліву,
Адзіноты маёй залатой.

Суразмоўцаў няма.
Ёсьць адказы,
Што аднекуль з Сусьвету прыйшлі
Без пытаньняў, таму, што ні разу
Я ня здраджвала гэтай зямлі.

*   *   *

Востра-мокрыя карункі
Голага гальля.
Дзень – глыток старога трунку,
Ноч – яна пасьля.

Ўсё далёка, ўсе далёка...
Ў сьветлае імжы
Стаць нялёгка, жыць нялёгка
Дрэвам на мяжы.

Пры сэзоннай паняверцы --
Быць альбо ня быць --
З кім пра сэнс жыцьця і сьмерці
Ціха гаварыць?

KAMUNIKAT.org

* * *

У дзяцінстве, сьветлым ці няўтульным,
Там, дзе можна гаварыць услых,
Мы гуляем у чужыя гульні,
Покуль не прыдумалі сваіх.

У дарослым, спрэс адказным сьвеце,
Дзе прасьцей узгоднена маўчаць,
Зноў ня ты кіруеш і прыкмеціў:
Дні, табой гуляючы, імчаць.

Вось і сталасьць, вось яна, -- і стома,
І пустэльня ў спляжанай душы.
Ўся гульня – трымацца нерухома:
Сьценкі надакучыла крышыць.

Старасьць, сад надзеяў апусьцелы...
Зноўку больку даўнюю крані:
Ці была магчымасьць не-удзелу
Ў той, заўсёды шулерскай, гульні?..

* * *

Цябе не заб'юць, бо так хочацца,
хочацца спаць,
Спакойна заснуць і спакойна прачнуцца,
як трэба...
І з'есці кавалачак мяса з кавалачкам хлеба,
І высербаць каву,
і вочы да неба падняць.

Цябе не заб'юць, можа толькі засунуць у мех,
Магчыма – каменны, магчыма –
пад назваю "вёска",
І там з ярлычком на шпагаце, звычайна, як коска,
Ты будзеш пыліцца альбо
адпрацоўваць свой смех.

Цябе не заб'юць – ну навошта каму мерцвякі,
Згрызоты сумлення пад старасць
і іншая трасца?..
Ты будзеш тлусцець, нервавацца,
лічыць медзякі,
Зрабіцца паэтам ніколі,
ніколі не ўдасца –
У нас забіваюць паэтаў,
а ты – не такі.

* * *

I мы з табой пакуль што сябры,
Сябры, сябры, такія сябры…
Сябры, пакуль зіма на двары,
Вялікія мы сябры.

I ты пакуль мяне не здасі,
Бо не замяніўся парадак сіл.
Не варта ў холад цяпельца гасіць,
Мароз – не варта гасіць.

I я пакуль руку падаю,
I я яшчэ праклён не пяю,
I важкія словы ўслед не плюю...
Але – іх абдумваю.

KAMUNIKAT.org

*   *   *

Ах, бывай, бывай, Радзіма!
За вагонным шклом
Дождж "мінула" і "магчыма"
Зьвязвае вузлом.

Ні абставінам, ні лёсу
Саступаць ня след.
Выбраў сам сярод хаосу
Гэты вось білет.

Сэнс шукаць у гэтым сьвеце
Стоміцца любы...
– Там, mon chére, куды мы едзем,
Сьветла... быццам бы.

KAMUNIKAT.org

* * *

Ты помніш тое, што у сне
Наканаванасьцю завецца:
Цягнік прыпынка не міне,
Пейзаж мяняецца ў вакне,
І толькі зорка – застаецца.

KAMUNIKAT.org

* * *

У той маленькай, ціхай зале
На сотню ці другую месцаў
Ён апавяў краіну цудаў,
Дзе ўсе мы марылі пабыць...

Ён пеў як той, хто гэта бачыў,
Ён пеў як той, хто гэта ведаў,
І ўсе мы зноў, зачаравана,
Жадалі слухаць і глядзець.

Ды вось адзін дзівак у нечым
Тужліва-жоўтым па блакіце
Сказаў яму па заканчэньні
Канцэрта – сам я гэта чуў:

-- Нашто зрабіў, мой бедны браце,
Ты так, што мы пры ўсіх дабротах
Тваіх, і продкаў, і нашчадкаў,
Усё ж ткі выгналі цябе?..

* * *

У канцы спадзяваньняў і веры, гарэлкі і кавы,
Калі мы зьнемаглі пад цяжарам, што нам не належаў,
Паспытаўшы на смак і любові, і помсты, і здрады,
Безь віны і зь віною, як кожны, хто жыў і жыве,

Ён зьявіўся, як быццам зь іконы – пры німбе і славе,
Зь Ім спакойная радасьць прыйшла, разьлілася па
сэрцы,
Ён усё дараваў, і прабачыў, і даў бласлаўленьне,
І пайшоў... Мы глядзелі, як Ён адыходзіць да сонца –
Чорны цень у нямым зіхаценьні... Вось так.

KAMUNIKAT.org

* * *

Чуеш, зьвініць глеба –
Гэта ідзе восень...
Калейдаскоп неба:
Хмара, прамень, просінь…
Хто з нас ня быў забіты,
Хто з нас ня быў праданы…
Лёс яшчэ не пражыты,
Добры ці нежаданы...

Самай парой гразкай
Зь іншага клічуць свету,
Вабяць сваёй казкай,
Быццам другім летам...
Спыняць мяне ня звады,
І не магчымасць болю:
Я не люблю здрады,
Бо вызнаю волю.

Волю пачуцьцяў й волю
Выканаць абяцанку,
Кожнаму даць патолю –
Вечару і сьвітанку.
Ёсць тут адна маркота,
Цалкам яе даволі:
Можна набыць самоту
Разам з маёю воляй.

kamunikat.org

* * *

Год замяняе на год
Ціхасьпеўны гадзіньнік...
Не затрымаць у руках
Зорна-цёплага лета...
Так і ня споўніць жыцьцё
Залатой абяцанкі...
Я застануся з сабой,
Я застануся як ёсць,
Я застануся жывой,
Бо ня зьменіцца вецер.

Мары народзяць тугу,
За тугой прыйдзе роспач...
Роспач хранічная можа
Адчаем назвацца...
Вам, летуценны герой,
Даць імя – бессэнсоўна.
Вы не жадалі мяне,
Вы не кахалі мяне,
Мы незнаёмыя, так,
Я скажу вам – бывайце.

Для адмысловых забойцаў –
Забойства надзеі,
Для ледзяных рэалістаў –
Адмова фантазій...
Першых ня маю узроўню,
Другім – не належу...
Ды абяцала забіць,
Ды абяцала маўчаць,
Бо абяцала сабе
Датрымацца да заўтра.

* * *

Зноў прыйшла туга -- тугі адбітак болю…
Хоць бы папярэдзіў, лёс, мяне сьпярша!..
Быццам нешта дужа просіцца на волю –
Ці то гэта песьні, ці сама душа.

Я вас разумею – жыць са мной балюча,
Й не хапае часам хлеба да вады…
Выпусьціць вас можна – зломкаў неўміручых,
Толькі да каго вы пойдзеце тады?

Песьні ў сьвеце сьвеціць не пасад пачэсны –
Цемра ды галеча, зьдзекі за сьпіной...
Не далі мне, песьні, радасьці вы ўвесну,
Восеньню каханьне вывелі віной.

А душы зарана не бяруць у неба,
На зямлі ж няпроста з лёсам ваявацъ…
Не зрабіўшы справы адлятаць ганебна, –
Будзем далей разам плакаць ды сьпяваць.

Будзем крочыць разам да чаканай даты,
Тэрмін свой адбудзем, хай так цяжка жыць…
А калі напору не стрываюць краты,
Будзе ўсім нам воля. Дзесь павінна быць…

* * *

Пакуль што вольныя плысьці
Туды, дзе нас не чакаюць,
Пакуль што вольныя мерыць
Ня так, як лёс загадаў...
Пакуль “пакуль” – не “калісьці”,
І тут яшчэ сустракаюць
Віном, і можна праверыць –
Жывы хто нас прыгадаў
Ці рэха...

Ці рэха помсьціць за тое,
Што нам ужо не належыць,
За нас у мінулым часе,
Якія мы – і ня мы...
І п’ём віно залатое
За тыя старыя межы,
Што зваліся кімсьці “шчасьцем”,
Былі ж – пачаткам зімы
Для іншых.

Для іншых межаў і ведаў
Свая надышла гадзіна...
Шыбуем туды, дзе сонца
Вычэрчвае небакрай...
А там – і цуды, і беды,
І пекла сярод ільдзінаў...
Ідзём і ідзём бясконца,
Жыцьцё за жыцьцём – стварай
Пакуль што...

* * *

Калі мне стане ўсё адзіна
На скрыжаваньні двух стагодзьдзяў,
Перад вачыма нейкіх судзьдзяў,
Я адыду за небакрай.
Знайду часовы адпачынак
Ад тых, хто помніць і ня помніць
У неядомай вам краіне,
Адзінаіснай для мяне.

Калі мне стане ўсё адзіна –
Улада, грошы, войны, слава, --
Нарэшце зьявіцца магчымасьць
Дазваньня зьнікнуць, як сканаць.
Пайсьці кудысь і не вярнуцца,
Пакаштаваць бяздомнай волі
І зь нейкіх невядомых выспаў
Даслаць табе адзіны ліст.

Калі мне стане ўсё адзіна,
Змагу прыходзіць як таемны
Жыхар ці неба, ці ня неба –
Адсюль так цяжка разлічыць…
Я разьлічу і разьлічуся
З усімі формамі сусьвету,
А што далей са мною будзе,
Хай не цікавіць вас усіх.

* * *

Мы непатрэбныя нікому
У гэтым лепшым з трох сусьветаў,
І гэта лепшая з пачутых
Адносных ісьцін, гаспадар…
Ты сёньня нас, залётных птушак,
Частуеш, як пачэсных госьцяў…
Магчыма, мы і праўда ў нечым
Вышэй за ўсіх тваіх сяброў.

Сьвятыя тут, а там – шалберы,
Дзе ваяры, дзе баязьліўцы,
Але ня вінныя нікому,
Як і ніхто ня вінны нам.
Даўно маглі б пайсьці да дому,
Які і вабіць, і чакае,
Ды нешта нас трымае ў сьвеце,
Дзе мы разблытваем шляхі.

Сьляпыя, доўгія, чужыя,
З вузламі чорных скрыжаваньняў,
А ніткі новыя бясконца
Людзьмі прадуцца, і таму
Няхутка будзе адпачынак…
А тут? Тут мы якраз за працай:
Прыйшлі пазваць, шаноўны пане,
Цябе ў дарогу да сябе.

...Мы непатрэбныя нікому,
Але ты заўтра пойдзеш з намі...

# II. Man

KAMUNIKAT.org

*   *   *

Хто я за сёньняшнім ранкам?
Толькі нязграбны мінак...
Зьніклі мае спадзяванкі,
Жарсьці спагналі каханкі,
Попел – ніякі на смак...

Болю не перагаворыш,
Лекаў ад праўды няма...
Тых, незабытых, ня скорыш,
Гэтых, сьляпых, не адорыш,
Вочы ня плачуць – зіма...

Вось ён – ставок і запруда,
Месца для светабыцьця...
Вершы мае самагуды,
Нам не падзецца нікуды
З гэтага злога жыцьця.

KAMUNIKAT.org

* * *

Як геніяльны псіхааналітык,
Я разглядаю рухі вашых душаў,
Я выкрываю кожнае жаданьне,
Я разьбіраю кожнае пачуцьце.
Не, не сэксот я, не дзеяч, ня крытык –
Я назіральнік, я асноў ня зрушу,
Мяне цікавяць... рэдкія выданьні,
Каб нешта ўзяць зь іх для свайго шматкуцьця.

Як акуратны, спрытны вівісэктар
Я на шматочкі рэжу кожны позірк,
І тон, і слова, і парадак рухаў,
І з тых шматкоў складаю замалёўку,
Якая мае іншы склад і вэктар
Наканаваньня й веданьня аб змозе...
Усё лаўлю спрактыкаваным вухам,
Усё капну ланцэцікам-рыдлёўкай.

Як той мастак, што зьведаў таямніцы
Свайго майстэрства і чужых майстэрняў,
Што можа сьвет зрабіць з рэфлексаў фарбы,
Ясву паклаўшы і праліўшы цені,
Жыву і я, і першаснай крыніцай
Стварэньня мапаў шляху цераз церні
Да сьветлых зорак мне слугуюць скарбы
І бруд усіх тых душаў летуценных,
Зь якімі жыў як псіхааналітык,
Зь якімі быў як спрытны вівісэктар...
Зь якімі быў я...
У якіх я жыў...

* * *

Адзінокая зорка гарыць
У пранізьлівай цемры...

Я іду да цябе, бо ты ёсьць,
Адзінокая зорка!
І ня спыніць мяне
Разуменьне бясконцасьці шляху,
І вар'яцтва яго,
Бо калі гэты шлях я асілю,
Ты ня прымеш мяне –
Ты зусім адзінокая зорка.

Неяк нехта спытаў,
А чаму мяне гэтак хвалююць
Незьдзяйсьняльныя мары,
І што так упарта шукаю
У пустэчы, якую ніхто
Ні цяпер, ні ў мінулым
Не наважыўся нават назваць,
Бо яна больш за слова?..

-- Я шукаю навукі, --
Тады адказаў я з усьмешкай, --
У людзей гэтых ведаў
Няма і ня будзе ніколі.
Людзі разам жывуць,
Людзі разам пасьля паміраюць,
Я ж хачу навучыцца
У зоркі
Яе адзіноце...

Адзінокая зорка
Гарыць.

* * *

Я змушаны жыцьцё цярпець…
Часовым суцяшэньнем сьмерць
Уночы мне прыходзіць пець
Спакою калыханку.
Спраў недаробленых – гара,
Таму ўсміхаецца зара:
Працуй, пацей; трываньне, раб! –
Прыкуты ты да ранку.

Усё скончаецца. Пасля,
У часе і прасторы,
Знайду старога караля,
Стваральніка твайго, зямля,
Твайго жыцьця – і гора.

Знайду. Змагу за ўсё спагнаць.
Тады ўжо можна і паспаць,
Самому ўнікнуць спакушэньня
Стварыць сабе сусьвет кішэнны.

* * *

Такая сталая жанчына
Стаяла побач на пероне…
Я гаварыў, ды не парушыў
Яе абачлівы спакой.

-- Армагедон? Якое глупства!
Усё спрадвек распланавана,
Ужо ніякая малітва
Не дапаможа й не даб’е.

А я глядзеў, дакладна ведаў –
Калі б хоць штосьці зварухнула
Яе душу з нейтральнай кропкі,
Я б мог спыніць Армагедон.

KAMUNIKAT.org

* * *

Прабач, я чортаў паэт,
А не стаматолаг ці лёкай,
І я не магу табе
Нічога прэзентаваць.
Не даў мне гэты сусьвет
Уменьня глядзець далёка,
Каб у прыстойнай дзяльбе
Кавалак свой адарваць.

Прабач, я чортаў паэт...
У якасьці падарунка
Адну несьмяротнасьць маю,
Такую, як мае верш.
Адзін спрадвечны сюжэт
У ім у любых варунках:
Я зноўку цябе кахаю,
Ты ж любіш сябе найперш.

І гэта – нармальны лад
Жыцьця... У сапраўдным сьвеце
Заўжды пераважыць слова
Набіты партаманет.
Нікому не ўзняцца над
Рэальнасьцю у манеце,
Адгэтуль усе высновы...
А я – я чортаў паэт.

* * *

Ах не, жанчына гэтая ня зь лёду,
Але зусім ня кожны ёй раўня...
Магу я памыляцца, ды Свабода –
Найлепшае жаночае імя.

На ўвесь здаровы сэнс яна плявала,
І кампрамісаў зь ім не прызнае.
І хай не прывязаць яе трывала –
Мне проста немагчыма без яе.

KAMUNIKAT.org

*   *   *

Колькі нас, звычайных музыкаў,
Так пяшчотна кранае струны,
Пацалункава любіць трубы,
Утрапёна па бубнах б'е…
Колькіх нас, звычайных музыкаў,
Не кранецца кола фартуны,
І зьнясіленых, рэдкачубых,
Пахавальны ўсхліп абаўе.

Блазнам сумным ці блазнам рыжым
Ты дажыў да пекла ці раю…
Тут прытулак апошніх ісцін,
Тут надзеі мае – ушчэнт…
І гучыць над драўляным крыжам
Нефальшывая праўда злая:
Мы любілі яе калісьці,
Гэту музыку. Coda. End.

* * *

Калі расчыняюцца дзьверы
У свет, што ствараецца словам,
Зьнікаюць пытаньні даверу,
Сумненьні хаваюць галовы.

Сярод залатых завеяў
Ступаюць мае сандалі.
Я там не жабрак з плябеяў,
Я той, каго там чакалі…

Тужліва, балюча, млосна,
Сняжынкі перад вачыма…
Не быць там – амаль невыносна.
Застацца там – немагчыма.

KAMUNIKAT.org

* * *

Я баяўся страціць волю,
Я баяўся страціць сэрца...
А музыкі гралі ў коле
Запаволенае скерца...
А яна глядзела ў неба,
Ды стаяла на каленях...
Так і трэба? Так і трэба
Тым, хто верыць у маленьні.

Выйшаў з хаткі, выйшаў з места,
Крочу вольна, крочу шпарка...
Пашукай якога зьместу
У хадзьбе па пекле Маркі...
Сэнс дарогі – у дарозе,
А канец яе вядомы:
У зьнямозе на парозе...
Дамавіна – сімвал дома.

Не застаўся. Дзеўцы – скруха...
Хай жыве і ставіць сьвечкі
Богу-Бацьку-Сыну-Духу...
Я ж жадаю крочыць вечна
Па шляхах па паспалітых
(Лёс мне мой не перайначыць)
Безь яе зь яе малітвай
Аб спакоі –сьмерці значыць.

*   *   *

Даўгакосая Панна! Калі б я толькі ведаў,
Што чакаеш мяне да апошняе зоркі…
Я прыеду – ты чуеш? – аднойчы прыеду,
Грукну ў дзьверы на золку.

Даўгакосая Панна! Калі б я толькі верыў,
Што ты помніш мяне безь ніякай надзеі...
Я прыеду. Аддзячыш мне мерай за меру –
За бязьдзейнасьць і дзеі.

Даўгакосая Панна! Я ня мог памыліцца –
Ты чакаеш, і помніш, і бачыш, як будзе:
Я прыеду, пакінуўшы іншым сталіцы...
Ранак, вецер і студзень...

Даўгакосая Панна! Я ўзмацнелы і сталы,
Што стаім на парозе-памежжы?
Я прыехаў!..Спазьніўся на месяц... Ты стала
Сьнежнай Паннай у сьнежні.

# III. Woman

KAMUNIKAT.org

* * *

У тым горадзе,
Дзе ніхто ня ведае нас
І таму ня можа закласьці
Нікому з чамусьці зацікаўленых
Нашай сустрэчай асобаў,

У горадзе Б…
(Прабач, гэта адзіны горад,
Дзе я магу ўявіць сабе
Гэтую сустрэчу –
Іншых гарадоў у мяне няма,
А да тваіх мне не даехаць)

Мы сядзім сёньня
У ціхай кавярні
З кубкамі кавы
(Але побач і кілішкі
З іншай вадкасьцю такога ж
Брунатна-цынамонавага колеру),
І ты тлумачыш мне,
Як трэба і што ня трэба
Рабіць у гэтым жыцьці,

Якое такое неспадзявана-
Прадказальнае,
Якое такое няправільнае,
І якое заўсёды мае рацыю,
З якой мая рацыя
Не спраўляецца...

Насамрэч ты
Ніколі нічога
Мне не тлумачыш,
І, можа, таму я сяджу зараз
Зусім у іншым горадзе,
Адна, напрыканцы дня,
І дапальваю будзённую
Банальную цыгарэту
Апошняй надзеі.

## Купальская песенька

Гэты хлопчык, ён будзе маім,
І да самага ранку…
Пакуль сыпяць груганы,
Пакуль крочыць узьнёслы вандроўнік.
Пакуль сто кажаноў
Так нястомна вартуюць паляну,
Дзе апоўначы полымем жудасьці
Выбухне кветка.

Гэты хлопчык, ён будзе маім
Да апошняй хвіліны
Неспакойнага сну ведуна
І малітвы манаха…
Да мінорнае ноты
Празрыстай бязьлітаснай песьні,
Што сьпявае рака,
У віры запрашаючы скочыць.

... Гэты сьвет падуладны мне змалку,
Ды пэўныя межы
Ёсьць у кожнага з нас,
Бы законы прасторы і часу...
Чуеш, ціха сьмяецца русалка
Зь зялёнай затокі:
-- Гэты хлопчык… Ён будзе з табой,
Пакуль ты не кахаеш.

* * *

...Каралева прыйдзе ноччу,
Зоркай жнівеньскага неба
Ціха скоціцца ў далоні...
Усьміхнецца: -- Ну, пакрочым,
І відовішчаў, і хлеба
Ты наеўся... Пераломім,

Адвядзем наканаваньне,
Перакрэсьлім ніткі лёсу,
Тканьне Паркаў перайначым.
Мне ў дарогу на сьвітаньні...
Заўтра мы пабачым восень,
Толькі як яе пабачым?

Я – Абраная, ты сёньня
Мной абраны... Як стрываеш,
Як зьнясеш сваё абраньне?
Вось я – зорка на далоні,
І пякуся трошкі... Маеш
Сілы на суіснаваньне?..

Што адкажаш, мілы дружа?
Вочы ў вочы не нахлусіш,
Толькі ж не адвесьці вочы...
Вецер. Дождж. Дарога. Лужы.
Ты адказ шукаеш, мусіш:
Каралева прыйдзе ноччу.

*   *   *

Давяраю картам лёс,
А каму яшчэ даверыць
Тое, што ніхто ўсур'ёз
У сапраўднае ня верыць?..

Тое, што мой лепшы дзень
Мне прынёс адно шкадобу,
Варты сьмеху для людзей
І багам недаспадобы?..

Тое, што рэальнасьць не
Супадзе ніяк са снамі,
Існасьць робіцца ў мане
І маной стаіць між намі?..

...Розум плавіцца ў віне,
У няздзейсьненым мінулым.
Час ужо зрабіцца мне
Больш спакойнай.
Меней чулай.

* * *

Восень страціла золата й ласку,
Ні цяпла, ні сьвятла не ўтрымаць...
Я прыдумваю добрую казку,
Дзе ні цемры, ні здрады няма.
Мой герой з таямніцай на твары
Існаваньня ня мае удзень,
Толькі ў прыцемках спозьненай марай
Ён зьяўляецца й побач ідзе.

І пакуль падаўжаюцца ночы,
І пакуль скарачаюцца дні,
Не гані мяне, прывідны хлопчык,
У слату ад сябе не гані.

Мы з табой – не звычайныя людзі,
Ты – з герояў, я – слова на шкле.
Пераводу ў рэальнасьць ня будзе:
Казцы доўга ня жыць пры сьвятле.
І ніхто табе выдаць ня змусіць
Мой адзіны і жорсткі сакрэт:
З сонцам я да рэалій вярнуся,
Нелюбімы рэальным паэт.

І пакуль падаўжаюцца ночы,
І пакуль скарачаюцца дні,
Не гані мяне, прывідны хлопчык,
У рэальнасьць мяне не гані.

* * *

Прызнаньні, наканаваньні...
Што зробіш – Сусьвет такі! –
Пяшчотным салодкім раньнем
Ніколі твайму дыханьню
Маёй не сагрэць шчакі.

KAMUNIKAT.org

* * *

Пакуль нічога не адбылося,
І ўсё няпэўна, і ўсё няўзнак,
Я большасьць словаў бяру ў двукосьсе,
І кожны колер лічу у снах.

Пакуль нічога не адбылося,
І можна выбраць між "так" ці "не",
Мяне трымае сяброўка-восень,
І цень надзеі нас не кране.

Чужыя мары – рознагалосье,
Магу паплакаць, магу пакпіць…
Пакуль нічога не адбылося,
Не выбіраць мне, каго любіць.

KAMUNIKAT.org

* * *

Шыбуеш пешшу,
І не шукаеш багоў...
Каханьне першы
З падраных тых ланцугоў.

Яго дзівосы,
Яго асьпект забыцьця
Аськепкам лёсу
Матляюць хвалі жыцьця...

Шыбуеш пешшу,
І не чакаеш выгод.
Складаеш вершы,
Якім тры тысячы год.

Яны маўчалі,
Яны чакалі цябе.
Але начамі
Вы зь імі зноўку ў журбе...

Шыбуеш пешшу,
І не жадаеш сьвятла.
Ты на памежжы,
Ты там заўсёды была.

Няма шкадобы,
Калі абрала сама
Сваёй аздобай
Свабоду слова “зіма”...

## Героі

Мае рамантычныя, гжэчныя, годныя,
Вы не адшукалі мяне.
Таму маё сэрца ды вочы халодныя,
Іх болей нішто не кране.

Мае рамантычныя, годныя, гжэчныя,
Вы зь іншымі бавіце час.
Вас зноўку казычуць пытаньні адвечныя,
І вабіць далёкі адказ...

Мае рамантычныя, родныя, розныя,
Сустрэчы ня варта чакаць.
Шляхі мяне клічуць занадта сур’ёзныя,
Каб памятаць ранкі пякуча-марозныя,
І нечую фотку ды кветку мімозную
Упарта ля сэрца трымаць.

*   *   *

*Я очень люблю случайные встречи*
*В эпоху большой нелюбви.*

***А. Макарэвіч***

Выпадковай была сустрэча.
Непазбежным было расстаньне...
Дык навошта яно? Пытаньне
Да таго, хто ведае болей.

Я ж ня ведаю. Халадэча --
Быццам вынік таго блуканьня,
Ненадзейных зачараваньняў
Ды бяздарна абраных роляў.

Час прамежкавы – некаханьне.
Час бязьлітасны – халадэча.
Выпадковай была сустрэча.
Непазбежным было расстаньне.

* * *

Трыццаць сёмая восень
Стаіць на парозе стамлёна.
То дажджом, то лістотай
Стукне ў шыбу, забыцца ня дасьць...
Нашых прыцемных зносін
Вачам не заўважыць зялёным,
Ўнутрывеннай істоты
Спакойна-пякучая жарсьць.

Трыццаць сёмая восень,
Ты й я, мы караем расстаньнем.
Дараваньня ня даўшы нікому,
Прабачым усіх...
Мы з табою ня просім
Адна у адной спачуваньня,
Калі разам да стомы
Блукаем па вулках глухіх.

Можа, восень -- бяда-не бяда,
Што паробіш ты з гэтым?
Кожны страчвае ў час маладосьць,
Застаецца адзін...
Але мне па-дзіцячы шкада
Адыйшоўшага лета,
І балюча прымаць прыгажосьць
Счырванелых рабін.

* * *

У прысутнасьці кветкі, якую ты мне падарыў
Выпадкова, відаць, ад штодзённай устойлівай стомы,
Я зусім не шкадую аб тым, што караблік прыплыў
У зацішную гавань, якая назвалася домам.

У прысутнасьці кветкі, якая ня можа сысьці,
І якая да самага скону маўклівая сьведка,
Прысягаю ніколі-ніколі сябе не клясьці
За абраную гавань (прысягі выконваюць рэдка).

Кветка, кветка, бывай! Я табе памахаю рукой,
Я ужо спакавала свае успаміны ды рэчы.
Ты са мной не паедзеш туды, дзе абраны спакой,
Я пакіну цябе аздабляць выпадковыя стрэчы.

KAMUNIKAT.ORG

* * *

Магія лічбаў і магія сфер
Зноў сутыкнуліся ў круглае даце...
Нас цяпер позна лавіць на давер,
Мы абазнаныя у сурагаце.

Я не крану адзіноты тваёй,
Ты не чапаеш маёе самоты...
Перамагаем малою крывёй
Восень з яе непатрэбнай лістотай.

Менскую каву і полацкі сум
Без перадумваньня і фіксаваньня
Недзе глыбока пад сэрцам нясу
Простым фэноменам су-існаваньня.

Ды нечакана ў сьляпой барацьбе
З жудасным сном разуменьне прыходзіць:
Я б так хацела паверыць табе,
Можа, адзінаму ў гэтым стагодзьдзі.

* * *

Мне сьнілася, што ты жабрак, і просіш
У першакурсніц грошы на гарэлку,
Яны даюць – паперку, дзьве, і тры,
(А за чатыры можна выпіць кавы…)

Пасьля, за кавай, не магла даўмецца –
У нас *былі* і грошы, і віно,
І час, і нат настрой быў адпаведны…
(Так, пра гарэлку – мы яе не п'ем).

Мой сон быў прыкрым і даўгім. Адно што
Усьцешыла – купальскай гэтай ноччу
Пераўтварэньні, пераапрананьні
Звычайныя; то ці не абавязак...
(Але чаму ты ўсё ж стары і п'яны,
Даволі брыдкі вулічны жабрак?).

*   *   *

Дзень твайго нараджэньня
Як водгульле сьмерці маёй...
Мне чамусьці здаецца –
Яны супадуць неўзабаве.
І чырвоная дата
Чырвонай набракне крывёй,
І такой застанецца;
Ужо ні адняць, ні прыбавіць.

Дзень майго заканчэньня…
Цябе пазавуць ад стала…
Тэлефоны – такая прыдатная
Рэч для навінаў...
Раптам зробіцца цёмна,
Як быццам ня сыпле сьвятла
Крышталёвая люстра…
Пад стольлю – адна павуціна.

Паімчыш на вакзал,
І праб’ешся, і купіш квіток,
І прыедзеш нарэшце
У мой перахрышчаны горад,
Дзе вісіць на сьцяне
У кватэры
Ўчарашні лісток
“25 жніўня”.
Карцінка: караблік і мора.

* * *

Я хваравбліва пераношу
Твае спакойныя памкненьні.
Мой боль балюча выцінае
Аб межы цэльнасці тваёй...
Карэктнай шчырасьці раскошу
Мне не давесці да збавеньня:
Хірургаў неяк не кранае
Факт напісаньня слоў крывёй.

Юнацтва памятае мары
Пра перарэзаныя вены...
Узрост сярэдні прапануе
Добрасхаваны адзюльтэр, –
Каб не грымелі кулуары,
Каб не цярпела гігіена...
Рацыянальнае пануе
За жалюзі еўраква тэр.

Як панна пэўнага узросту
Перабіраю варыянты,
Пасля кантрасна, як падлетак,
Дзялю "люблю" і "не люблю"...
Няпэўны стан, дзе ўсё няпроста,
Я ў ім разумны дылетантам,
І не зраблю ня так, ня гэтак,
Ня ведаю і як зраблю.

* * *

Навыдумлялася каханьне,
Якога быць ня можа з намі,
У незакончаным трываньні
Усе магчымыя шляхі…
У прошлым часе паляваньне,
Пачуцьці кшталту хваль-цунамі,
Запал і лёсанараканьні,
І нават горшыя грахі.

Навыдумлялася адносін,
Якіх ня можа быць у сьвеце…
Яны ня тое, каб ідэі,
Ды вельмі блізкія да тых
Шляхоў, якія мкнуць праз восень,
Зіму, вясну й жывуць у леце,
У промнях сонечнай надзеі,
У спадзяваньнях залатых.

Навыдумлялася – і хопіць,
Мая работа – не зламацца,
Тваё пацвердзіць існаваньне,
Цябе для казкі захаваць…
Пішу (хай так ніхто ня робіць),
Каб мне не падпарадкавацца
Неідэальнаму жаданьню
Табе патэлефанаваць.

*   *   *

***"...Пусть он сыграет надо мной."***
*"Машина времени",*
*"Он играет на похоронах и танцах..."*

Попел мой ад  Сафійскай горкі
Аднясе залацісты вецер,
Ён заўсёды мяне любіў...

Калі ты пражывеш болей,
Адшкадуй мне адзін вечар,
Паіграй на маім ветры,
Не зважай, што так стынуць пальцы...

Калі я пражыву болей,
Я наведваць цябе не буду.
Толькі тыя клады люблю я,
Дзе нікога майго няма.

*    *    *

Мілаю паэмкай мілая паэтка
Выціскае сьлёзкі з тоннай камянюкі:
Трэба ж неяк мужу набываць шкарпэткі,
Раз усе каханкі – злосныя манюкі.

KAMUNIKAT.org

# IV. Клясычныя практакаванні

KAMUNIKAT.org

* * *

Ты шыбуеш штодзённа
У напрамку да сьмерці,
Пад бязладнае скерца
Ты шыбуеш штодзённа.

Не твая завядзёнка,
І пячатку ня зьдзерці:
У напрамку да сьмерці
Ты шыбуеш штодзённа.

KAMUNIKAT.org

* * *

Каханьне нараджае несвабоду,
А я да волі прывіднай імкнуся.
Я болей да цябе не дакрануся:
Каханьне нараджае несвабоду.

І памяць пра яго я зьнішчыць мусіў,
Што перад тым самота і нягоды...
Каханьне нараджае несвабоду,
А я да волі прывіднай імкнуся.

KAMUNIKAT.org

* * *

Я нікому ня вінна болей
Думак, грошай ці абяцанак.
Вось усьмешка мая, сьвітанак, --
Я нікому ня вінна болей.

Воля -- лепшая з каляжанак,
Хай ніхто не падкажа ролю.
Я нікому ня вінна болей
Думак, грошай ці абяцанак.

KAMUNIKAT.org

* * *

Я зьведаў смак тваіх вуснаў,
А ўсё астатняе -- дробязь.
Трымцяць чаканьне і боязь:
Я зьведаў смак тваіх вуснаў...

Стварыў дзівосную повязь
Той час, цнатліва-спакусны...
Я зьведаў смак тваіх вуснаў,
А ўсё астатняе -- дробязь.

KAMUNIKAT.org

* * *

Абсурд жыцьця абсурдам сьмерці
Ня мае сэнсу падмяняць.
Тут не малюнак: не падцерці
Абсурд жыцьця абсурдам сьмерці.

Тузе паўсюль душу мне дзерці,
Дык што туды-адтуль ганяць?
Абсурд жыцьця абсурдам сьмерці
Ня мае сэнсу падмяняць.

KAMUNIKAT.org

* * *

Я ня дам табе памерці –
Плюнь на бездар прадказаньняў…
Словы з аркуша ня сьцерці –
Я ня дам табе памерці.

З новаю надзеяй ў сэрцы
Ты сваё сустрэнеш раньне…
Я ня дам табе памерці –
Плюнь на бездар прадказаньняў.

KAMUNIKAT.org

* * *

Чытаць трыялеты
У млявасьці лета…
Гуляць у эстэта –
Чытаць трыялеты.

Лунаць па-над сьветам
Як лунь, без білета…
Чытаць трыялеты
У млявасьці лета.

KAMUNIKAT.org

* * *

Чым далей, тым болей рацыі,
Эмоцыі – пад кантроль.
Такая цывілізацыя –
Чым далей, тым болей рацыі…

Ужо непатрэбны боль –
Набытая адукацыя.
Чым далей, тым болей рацыі,
Эмоцыі – пад кантроль.

KAMUNIKAT.org

*    *    *

Каханьне – заўсёды дадатак
Да нейкіх асноўных асноў.
Да грошай, сям'і, атэстата
Каханьне – заўсёды дадатак.

Падлічым здабыткі і страты,
Ды хочацца есьці ізноў.
Каханьне – заўсёды дадатак
Да нейкіх асноўных асноў.

KAMUNIKAT.org

* * *

Там, у небе – сонца,
Тут, у лесе – зграя…
Ціха дагарае
Там, у небе, сонца.

Звязвацца ня раю –
Паглядзі праз донца:
Там, у небе, сонца,
Тут, у лесе, зграя.

KAMUNIKAT.org

* * *

Тваёй атруты я жадаю
За тое, што яна твая…
Сноў зброя не бярэ мая –
Тваёй атруты я жадаю.

Ізноў пытаюць утрая
За слова горкае "кахаю"…
Тваёй атруты я жадаю,
За тое, што яна твая.

KAMUNIKAT.org

* * *

Ці ёсць што выпадковае на сьвеце,
Ці ёсць невыпадковасьць хоць адна?..
У чым твая віна ці не-віна –
Ці ёсць?.. Што выпадковае на сьвеце!

Ты зноўку выглядаеш, як вясна,
Але смяешся так, што плачуць дзеці...
Ці ёсць што выпадковае на сьвеце,
Ці ёсць невыпадковасьць хоць адна?..

KAMUNIKAT.org

*   *   *

Не пішы пра мяне нічога,
Бо нічога і не было…
Што звадзіла, што разьвяло –
Не пішы пра мяне нічога.

Ці зрасцецца тваё крыло,
Ці адолееецца зьнямога?..
Не пішы пра мяне нічога,
Бо нічога і не было.

KAMUNIKAT.org

* * *

Калі закончыцца мігрэнь,
Не паддавайся эйфарыі:
Узьнікнуць клопаты старыя,
Калі закончыцца мігрэнь.

Дадасьць – магу трымаць пары я
Праблем і кожны новы дзень...
Калі закончыцца мігрэнь,
Не паддавайся эйфарыі.

KAMUNIKAT.org

## *Паштоўка*

**“П**олацк” -- праштэмпелявана...
**О**хра дрэў, блакіт вясны,
**Л**анцужок крыжоў парваны...
**А**дзінокі, неспазнаны,
**Ц**іха сьпіць, зачараваны
**А**ксамітна-беззаганнай
**К**алыханкаю Дзвіны.

KAMUNIKAT.org

## Рандэль

Пераблытаўшы каханьне з вайной,
Не зьдзіўляйся спусташэньню душы,
Бо паўсюль замест падвойных вяршынь
Атрымаеш празаічны двубой.

Ваяры ж малююць фарбай адной,
Бо усё жыцьцё жывуць на мяжы;
Пераблытаўшы каханьне з вайной,
Не зьдзіўляйся спусташэньню душы.

За любым замком, за кожнай сцяной
Сніць сталёвыя ствалы і нажы.
Заваёўнік... Ты навекі чужы,
Існуеш цяпер маной і віной,
Пераблытаўшы каханьне з вайной.

## Рандо

Поўня! Поўняй сэрца поўна,
Я іду, і мне ня варта
Абарочвацца і помніць –
Ззаду краты, ззаду варта.

Ноч варожыць, сьнег – як воўна,
Толькі лепей грэе кварта…
Ах, няўжо мне не ўсё роўна –
Мне, каго чакае ўпарта
Поўня!..

Хто да раю, хто і ў Тартар,
Я ж імкнуся, безумоўна,
Да цябе адной, бяз жартаў,
Поўня!

KAMUNIKAT.org

## Рандэль

Якія могуць быць благія думкі,
Калі я так сканала дасканала?..
Маё жыцьцё ніяк не закранала
Тых, хто цягнулі з памінаньня сумкі.

Жыла – ад плётак аж вішчалі кумкі,
Затое сьмерць усіх пераканала:
Якія могуць быць благія думкі,
Калі я так сканала дасканала?

Узорна-паказальныя рахункі,
Нічога, што замнога ці замала...
І тое, што ў агонь мяне загнала –
Сумленьне найвышэйшага гатунку –
Якія могуць быць благія думкі!

KAMUNIKAT.org

# СЭКСТЫНЫ АДНОЙ ЗІМЫ

## Сьнежань

Пячатка цемры, году мроя-сон,
Ізноў ён, час праверкі росту, Сьнежань...
Згуляны гульні, скончыўся сезон,
Настрою, думкам, моцы, волі – межань,
Няма ні ўзлётаў, ні правалаў: фон...
Але ніхто не пазначае межы.

Пакуль у кола не замкнулі межы,
Пячатцы цёмнай не прыцíснуць сон.
Крыштальны, дзіўны, любы, сьнежны Сьнежань,
Ты цемры час і беласьці сезон,
Глухі і звонкі тон, паводка й межань,
На роздум і тугу – найлепшы фон.

Навісла неба як нейтральны фон,
Завея скрала далягляду межы...
Пячатка цемры мроіцца як сон,
Стаю на цэнтры сьвету – сьнежыць Сьнежань;
Бяскрыла птушкам – нежывы сезон,
Жыцьцё застыла на адзнацы "межань".

Сьвятлу і дням не разгарнуцца, межань
Для іх настаў, яны як плямкі; фон
Тут прыцемкі, і трохі зор на межах
Пячаткі цемры... Бачыш іх як сон...
Ці помніш, што калісьці быў ня Сьнежань,
А нейкі іншы, колерны сезон?..

Палю паперы – гэта мой сезон
Рахункі зьвесці ў падрахунак. Межань
На брудную паперу. Чысты фон
Рыхтую, і на ім малюю межы.
Пячатка цемры падаўжае сон,
Дапамагае перадумаць Сьнежань.

Усё, што не змагла – даруй мне, Сьнежань!
Ты кропку перайшоў, ідзе сезон
Адносін іншых і для іншых. Межань
Закончыўся, і адступае фон,
І промнік высвятляе сьвету межы
На Новы год. Пячатка цемры – сон.

Ёсць руйнаваньня час. Ён – межань межаў,
Сезон для заўтра, адпачынак-сон.
Пячатка цемры – фон, бялюткі Сьнежань.

KAMUNIKAT.org

# Студзень

Згарэла зорка. Кожны Новы год –
Імгненны гук, якога ўжо не будзе.
Кружляюць стрэлкі, не прыцішаць ход,
Сьвяточны дзень – твой падарунак, Студзень,
Спакою абяцанка ці прыгод...
Табе – тваё. Мне – ціхі, ціхі будзень.

Мне сумна ў сьвяты, мне варожыць будзень...
Згарае зорка, адзначае год
Мінулы і нязменны. Заўтра будзе
Магчымае сягоньня, й новы ход
Яшчэ чакае вырашэння, Студзень.
Ну, ці аматар ты якіх прыгод?

Няведаньня ня вернеш, а прыгод
Бяз гэтага не прычакаеш; будзень
Знаёмай зоркай гасьне з году ў год
І твар на твар мяняе, і ня будзе
Жаданьня прыпыніць, нарэшце, ход,
І зразумець, а чым адметны Студзень?

Сярэдзіна зімы. Марозна. Студзень.
Прастуда як падзея. Для прыгод.
Шукайце здаравейшых целам. Будзень
Пачнецца з асьпірыну. Зорны год:
У той жа тэрмін той жа насмарк будзе,
Любімае хваробы роўны ход.

...Мяне вучылі, як спыняюць ход,
Як рвуць ніты, і з Траўня робяць Студзень,
Як падплятаюць ворагу прыгод
Ня лепшага гатунку, нішчаць будзень,
Як гасяць зоркі, скарачаюць год...
Умею. Не раблю. *Кіна ня будзе.*

Гляджу, не зачаплю. Хай тое будзе,
Што й без мяне было б – звычайны ход
Падзей і часу. І за сьнежнем – студзень,
І кожнаму – ягоны лік прыгод,
Ягоны яблык, выбар, сьвята, будзень...
Згарае зорка – абнаўляе год.

(Падзякі не чакай – яе ня будзе,
А будзе будзень, мерны ход прыгод...)
Год пачынае задуменны Студзень.

# Люты

Працяг для года. Для зімы – канец.
Свае пытаньні вырашае Люты
Даволі жорстка. Плавіцца сьвінец,
Рыхтуюцца сякера і атрута.
Стрымай трымценьне, юны і сівец,
І падрыхтуй да бойкі атрыбуты.

Вядома знаўцам лепшым: атрыбуты
Пачатак чараў; толькі пад канец
Адною думкай працінаеш Люты,
І пырскае расплаўлены сьвінец
У кубачак з салодкаю атрутай...
Але ці варта час цягнуць, сівец?

Так, сівізна больш жорсткая, сівец,
Чым страхі маладосці – атрыбуты
Пачатку шляху: у канцы канец
Найбольшы страх... Пан завірухі, Люты,
Захоча – перапаліць і сьвінец
Й прывабіць тонкай беласьцю атруты.

"Усё ёсць лекі нам, і ўсё – атрута,
У дозе справа", – згодна я, сівец,
Не ўладныя над намі атрыбуты
Былі спачатку, значыць, не канец;
Перажывем як пераможам Люты
І з нізкіх сьнежных хмар тугу-сьвінец.

Падзелены на кулі, нам сьвінец
Павагі вартым болей, чым атрута
Здаецца, хоць усё адно, сівец:
Ці важна мне, якія атрыбуты
Наблізяць мой, чаканы мной, канец,
І жнівень гэта будзе, май ці люты?..

Зарокаў не трываюць богі, Люты...
Іх зброя мне вядома: не сьвінец
Звычайна гэта, а душы атрута
Больш тонкая, больш гідкая, сівец...
Тут зайздрасьць, сквапнасьць, хцівасьць атрыбуты...
Пачатак ёсць... Што ж, падкажы канец.

Сівец гатуе атрыбут-атруту,
Тут сплецены пачатак і канец...
Дапамажы сьвінцом. Так лепей, Люты.

# РОЗДУМ

**Вянок санетаў**

**Лёс дасьць таму, хто мае сілы быць**
**Адзін сярод спакусы множных лікаў**
**Надзею як кароткую адлігу**
**Сярод зімы, дзе нам канаць і жыць.**

**Хай страх усіх у гурт калісьці клікаў,**
**Калі ня здаўся прывіднай начы –**
**Тваё жыцьцё аднойчы прагучыць**
**Крыштальнай нотай у мяшанцы зыкаў.**

**Ёсьць шанц – бяры яго ці не бяры,**
**Але ён ёсць, і з ім мы не зьвяры,**
**Якую б ты сабе ні ставіў мэту…**

**…Гісторыя без ідэа-аздоб**
**Для гэтага асобнага сусьвету**
**Складаецца з гісторыяў асоб.**

1.

**Лёс дасьць таму, хто мае сілы быць**
Няскораным, з душой неўтаймаванай,
Шуканьнем адмысловым расхаванай:
Навошта, як, дзеля чаго нам жыць?

Сярод сьляпых, глухіх, унармаваных,
Якім адно нажэрціся баліць,
Адзінае, што можа ажывіць –
Змаганьне за магчымасьць стаць пазваным.

А тут чакае новая навала:
Пазваных шмат, дайшоўшых вельмі мала,
І хто там быў, куды яны дайшлі?

І ўсё ж, пакуль гадзіньнік не адцікаў,
Ідзі па гэтай спляжанай зямлі –
**Адзін сярод спакусы множных лікаў.**

2.

**Адзін сярод спакусы множных лікаў:**
– Дзівак, нічога новага няма,
Глядзі, было! І гэтая зіма,
І сам ты, растакі мудрэц вялікі

Калісьці быў, і жыў, і пеў дарма...
Чарговае жыцьцё пачаўшы з крыку,
Змаўкаюць людзі – хто дзеля разьліку,
Хто ад таго, што ведае зашмат.

А рэшта нешта піша і шукае
Спачатку непадобнасьці, якая
Хутчэй чым што зьняславіць і заб'е,

А потым аднадумца, быццам кнігу,
Дзе слова вечна-новае дае
**Надзею, як кароткую адлігу.**

3.

**Надзею як кароткую адлігу,**
Пасьпешную прадвесьніцу вясны,
Шануй за тонкі водгалас вайны
Супроць сябе цяперашняга мігу.

Калі ідзеш цераз гушчар лясны,
Дык марай пра прасторнае паціху
Уласнае пераадоліш ліха,
Так, тое, што зьнянацку б'е праз сны.

...Хапае дробнай марнай валтузьні,
Ў вядомых межах – што ты не вазьмі –
Сьвет круціцца... Штампуюцца падзеі...

І толькі тым, хто здольны штосьць зьмяніць
Душу сагрэе вечная надзея
**Сярод зімы, дзе нам канаць і жыць.**

4.

**Сярод зімы, дзе нам канаць і жыць,**
Асоб бракуе, а натоўпу – лішак.
Хто б зьвёў адсюль ціхенькіх шэрых мышак,
Бо зграяй зьнішчаць, што і не згарыць.

Дудар узьняў ня дудку, а кілішак –
Ці горла, ці сумленьне падлячыць.
Ня здолеў зьвесьці, прыйдзецца вучыць –
Ці ведаў ты, шукаючы зацішак?..

Настаўніцтва ж – складанейшая справа,
Не мае паказальнікаў: направа,
Налева... ці ў які там іншы бок...

Шалее завіруха. Час адліку
Цяпер – твой самастойны крок,
**Хай страх усіх да гурту гнаў і клікаў.**

5.

**Хай страх усіх да гурту гнаў і клікаў,**
Таго, хто добра помніць інтэрнат,
Самотай не спалохаеш, мой брат,
Цуд цішыня пасьля сяброўскіх гікаў.

Абавязкова-патачны парад,
Натоўп, узоры пераможных рыкаў,
Хто зможа там, сярод плябейскіх тыкаў
Разгледзець тло, хлусьню і заняпад?

Няхай не сьлепіць таннае сьвятло –
Яно ў разніцу шмат каго зьвяло,
Сьвятлу сапраўднаму ахвяр тупых ня трэба.

Убачыш – толькі вочы падлячы, –
Ня цемру-бруд, а ўсё прадоньне неба,
**Калі ня здаўся прывіднай начы.**

6.

**Калі ня здаўся прывіднай начы,**
Валодаеш і словамі, і справай,
Ёсьць абавязак, лёс, і нават права
Да новай тайны падбіраць ключы.

Ды, ведаеш, аднак, – яна гарчыць,
Яна ня з танных, гэтая забава –
Разгадваць таямніцы. Голас славы
Ня піскне... Ды і ў страўніку бурчыць.

Рашаць самому – як кантраляваць,
Тварыць ты будзеш, спажываць ці спаць,
З нас кожны сам сабе загад і варта.

Твой талент – дык табе і валачы,
І слухаць, чым – праклёнам, одай, жартам
**Тваё жыцьцё аднойчы прагучыць.**

7.

**Тваё жыцьцё аднойчы прагучыць**
Абавязкова – хоць бы крыкам першым
Пры нараджэньні. Гэта толькі вершы
Маўчаць спачатку, каб пасьля вучыць.

Вось колькі слоў, з душы абгортку зьдзершы,
Звіняць у ёй; ці труціць, ці лячыць –
Яны прыйшлі, і ўжо не заглушыць
Мелодыі заснуўшы ці памершы.

Наданьне гукам незвычайнай сілы
Ёсьць не забаўка, не складныя крылы, –
Атрута-ноша, што ня так – заб'е...

Але – нясеш, сярод плявузг і ўпікаў
Знаходзіш думку-срэбра, што пяе
**Крыштальнай нотай у мяшанцы зыкаў.**

8.

**Крыштальнай нотай у мяшанцы зыкаў**
Гучала песня... Слухалі яе?
Ня вельмі каб. Прыгадвалі свае
Развагі, сваркі, дробязі, пазыкі, –

Людзям штодзённа хлеба не стае...
І нехта з тых, хто з песьняй гора мыкаў,
Захопленых не прычакаўшы крыкаў,
Шматзначнае маўчаньне вызнае.

Ня варта захапляцца нематой,
Бо той дарма сьпявае – толькі той! –
Каму карціць убіцца ў ляўрэаты.

...Даўно зіма лютуе на двары...
Пазваць вясну праз ледзяныя краты
**Ёсьць шанц – бяры яго ці не бяры.**

9.

**Ёсьць шанц – бяры яго, ці не бяры...**
А як ня тое возьмеш? Вось зьнявага!
Здаецца, і бяз рызыкі нябдага,
Хай выбірае той, хто на гары.

Паслухайце, параду дасьць бадзяга,
Панове гандляры і ваяры:
Выпадак-кіска мае кіпцюры,
Таму сядзі спакойна і ня зьвягай!

Але аднекуль выпаўзае страх
І трохі-трохі не зьязджае дах –
Калоціць падсьвядомая пагроза.

...Адплоціць так – жахнуцца дактары –
Зьняважаны нескарыстаньнем розум...
**Але ён ёсць, і зь ім мы – не зьвяры.**

10.

**Але ён ёсьць, і зь ім мы не зьвяры, –**
Дзівак, пясьняр, прарок… ці проста – homo,
Які ня воўк, які паўсюль як дома,
Таму што дом спалілі ваяры.

За добрае і слаўнае, вядома,
Змагаюцца, ды лепшае пары
Ніяк не дачакаецца стары,
Наўрад пашчасьціць тут і маладому.

Заўсёды пры нястачы і галечы
Дух захаваць прадонна чалавечы,
Перамагаць бяз куль, нажоў і лат,

Дзе позіркам, дзе песьняй недапетай –
Ён можа ўсё. Таму трымці, салдат,
**Якую б ты сабе ня ставіў мэту.**

11.

**Якую б ты сабе ня ставіў мэту –**
Хто ведае, ці будзе заўтра час
Паскардзіцца праз сьлёзы – не на вас,
Ня вам, ня ім, – а рулі пісталета?

Ці сьвеціць сонца прышласьці для нас?..
Жыві, як быццам хутка вып'еш зь Леты
Глыток, другі… Тады ўсё роўна – дзе ты
І зь кім, і для каго шукаў адказ.

Варушыцца сабе Сусьвет-кірмаш,
Губляецца спалоханы мураш –
Такую кашку людцы заварылі!..

"Жадаў, імкнуўся, намагаўся…" Стоп!
Тут застаецца тое, што *стварылі*, –
**Гісторыя бяз ідэа-аздоб.**

12.

**Гісторыя бяз ідэа-аздоб,**
Гісторыя бяз ідэа-абгорткі
Пытаньня мае смак салёна-горкі:
Нашто каму такая колькасьць спроб?

Шчасьлівых лёсаў не вяшчаюць зоркі:
Ня тое, дык другое; без жалоб
Не застаецца ні арол, ні клоп,
Хоць сьцяміць бы, аб чым ідзе гаворка!

...У чорным сьне прымроілася яўна
Такое, што страшыць небеспадстаўна:
Няўмелы, графаманісты паэт.

Перабірае проста, як сюжэты,
Ён нашы лёсы, марыць пра санет
**Для гэтага асобнага сусьвету.**

13.

**Для гэтага асобнага Сусьвету**
Што прапануеш, пане гаспадар?
Патоп ці землятрус, вайну, пажар,
А, мо, букецік незвычайных кветак?

Дарэчы быў бы ён вясной, і лету
Не перашкодзіць пара добрых мар
Пра чыстую красу, якая дар,
Непадуладны кулі ці дэкрэту.

Гандлююць шмат чым і купляюць шмат,
Але ня ўсім кіруе аўтамат,
Купюрны шоргат і кавалак мяса...

Цудоўнае, галоўнае з аздоб
І прышласьці, і Залатога Часу,
**Складаецца з гісторыяў Асоб.**

14.

**Складаецца з гісторыяў асоб**
Любая казка ці апавяданьне…
Наўрад увойдзеш нават у паданьне,
Калі ціхенька побач з жонкай соп.

З нябыту непаўторнае вяртаньне
Чакае Першых, Вечнасьці крысо
Кранае толькі іх... Аднак лязо
Таксама ім прызначыла спатканьне.

Ну вось і выбірай сабе чаргу!..
Я тут нікому не дапамагу,
І выбар той – наколькі ён уладны?

Дзе розніца – пасціцца, плакаць, піць,
Сядзець, ісці – калі адно дакладна:
**Лёс дасьць таму, хто мае сілы быць.**

KAMUNIKAT.org

# ЗМЕСТ

**I. УСЕ МЫ ФІЛЁЗАФЫ...**

Усе мы філосафы…
Калі я зьнікну (гэта будзе хутка)…
Дажыла да зялёнай травы…
Месяц верасень, месяц верасень…
У тым варыянце, калі...
Ці ня з гэтых начэй…
Здані – ІІ, дарожныя
Відаць, сапраўды сябраваць…
Марозік і крышку сонца…
І гэты горад, празь які…
Што майму добраму Богу…
Мара здохла, падняла ножкі…
Што мне ў табе асэнсоўваць, дурное стагодзьдзе…
Спачатку прыдумаць сабе каляндар…
Кожны мае свой страх…
Чакаць крыгаходу…
У настаўніках – сьмерць…
Я смалю перасохлы тытунь…
Нашы прыстойныя п’янкі…
Пакіньце багоў у спакоі...
Не было пятлі і пылу…
Суразмоўцы далёка…
Востра-мокрыя карункі…
У дзяцінстве, сьветлым ці няўтульным…
Снег свеціцца. Цемра…
Цябе не заб'юць…
І мы з табой пакуль што сябры…
Ты помніш тое, што у сне...
У той маленькай, ціхай зале...
У канцы спадзяваньняў і веры, гарэлкі і кавы…
Чуеш, звініць глеба...
Год замяняе на год…
Зноў прыйшла туга, тугі адбітак болю…
Пакуль што вольныя плысьці…
Калі мне стане ўсё адзіна...
Мы непатрэбныя нікому…

**II. MAN**

Хто я за сёньняшнім ранкам…
Як геніяльны псіхааналітык…
Адзінокая зорка гарыць…
Я змушаны жыццё цярпець…

Такая сталая жанчына…
Прабач, я чортаў паэт…
Ах не, жанчына гэтая не з лёду…
Колькі нас, звычайных музыкаў…
Калі расчыняюцца дзверы…
Я баяўся страціць волю…
Даўгакосая Панна! Калі б я толькі ведаў…

**III. WOMAN**

У тым горадзе…
Купальская песенька
Каралева прыйдзе ноччу…
Давяраю картам лёс…
Восень страціла золата й ласку…
Прызнаньні, наканаваньні…
Пакуль нічога не адбылося…
Шыбуеш пешшу…
Героі
Выпадковай была сустрэча…
Трыццаць сёмая восень…
У прысутнасьці кветкі, якую ты мне падарыў…
Магія лічбаў і магія сьфер…
Мне сьнілася, што ты жабрак…
Дзень твайго нараджэньня…
Я хварабліва пераношу…
Навыдумлялася каханне…
Попел мой ад Сафійскай горкі…
Мілаю паэмкай мілая паэтка…

**IV. КЛЯСЫЧНЫЯ ПРАКТЫКАВАННІ**

Ты шыбуеш штодзённа...
Каханьне нараджае несвабоду…
Я нікому ня вінна болей…
Я зьведаў смак тваіх вуснаў
Абсурд жыцьця абсурдам сьмерці…
Я ня дам табе памерці…
Чытаць трыялеты…
Чым далей, тым болей рацыі…
Каханьне – заўсёды дадатак…
Там, у небе – сонца...
Тваёй атруты я жадаю…
Ці ёсць што выпадковае на свеце…
Не пішы пра мяне нічога...
Калі закончыцца мігрэнь…
Паштоўка
Рандэль (Пераблытаўшы каханне з вайной…)
Рандо (Поўня! Поўняй сэрца поўна…)
Рандэль (Якія могуць быць благія думкі…)
Сэкстыны адной зімы
Роздум. Вянок санэтаў